УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
______________ А.І.Жук
«_26_» __________ 2024 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-90/2024 /вуч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ МЯЖЫ XIX – XX СТАГОДДЗЯЎ

**Вучэбная праграма**
**ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура);**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура. Замежная мова**
**(з указаннем мовы))**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), зацверджаных 23.02.2023, рэг. № 050 – 2023/у, рэг. № 048 – 2023/у, рэг. № 49 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Т.П.Хоміч, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
А.У.Бразгуноў, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
А.С.Гурская, дацэнт кафедры менеджменту і камунікацый ПУА «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» _______________ Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 ад 29.10.2024 г.)

Загадчык кафедры _______________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 2 ад 24.12 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела _______________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі _______________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбнымі планамі падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)).

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» знаёміць студэнтаў з асноўнымі заканамернасцямі развіцця мастацтва слова ў перыяд станаўлення беларускай літаратурнай класікі.

Вучэбная праграма сарыентавана на канцэптуальнае разуменне гісторыі беларускай літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага руху, нацыянальнай спецыфікі, мастацкіх формаў адлюстравання і светапазнання, спасціжэнне і засваенне духоўных каштоўнасцей, якія закладзены ў творах літаратурна-мастацкай спадчыны.

Праграма ўтрымлівае аглядавы і манаграфічныя складнікі. У аглядавым даецца агульная характарыстыка перыяду мяжы XIX – XX стагоддзяў, вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі ў творчасці пісьменнікаў, раскрываюцца гістарычны, грамадскі кантэксты развіцця літаратуры. Манаграфічна прапануецца вывучаць спадчыну класікаў, а таксама творчасць мастакоў слова, што заявілі пра сябе як яркія індывідуальнасці, вызначылі мастацкі ўзровень літаратуры свайго часу і абумовілі ў многім далейшыя шляхі яе развіцця. Творчасць пісьменнікаў разглядаецца цэласна, з выхадам за храналагічныя межы дадзенага перыяду.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» заключаецца ў фарміраванні ўяўленняў пра самабытнасць нацыянальнай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў, пра станаўленне і развіццё мастацка-светапоглядных сістэм, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанравых формаў.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

1. фарміраваць сістэму ведаў пра літаратурныя падзеі мяжы XIX – XX стагоддзяў, творчыя постаці айчынных пісьменнікаў і іх мастацкую спадчыну;
2. навучыць студэнтаў арыентавацца ў свеце мастацкіх твораў;
3. фарміраваць і развіваць навыкі прафесійнага аналізу літаратурнага тэксту;
4. выпрацаваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці мастацкіх твораў;
5. выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязь з другімі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» адносіцца да модулю «Гісторыя беларускай літаратуры» і ўваходзіць у дзяржаўны кампанент установы вышэйшай адукацыі. Дадзеная вучэбная дысцыпліна узаемадзейнічае з вучэбнымі дысцыплінамі «Гісторыя беларускай літаратуры XIX стагоддзя» і «Гісторыя беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя», якія таксама ўваходзяць у модуль «Гісторыя беларускай літаратуры». Для вывучэння дысцыпліны «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» неабходна наяўнасць у навучэнцаў акадэмічных кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Вусная народная творчасць», якія адносяцца да модулю «Асновы літаратурнай адукацыі».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– шляхі развіцця нацыянальнай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў;

– узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю ці творчай манеры;

– канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў;

– сучасныя ацэнкі мастацкіх з’яў вывучаемага перыяду;

– праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці кампазіцыі, вобразна-выяўленчыя сродкі;

– герояў твораў, іх светапоглядныя пазіцыі, рысы характару, месца ў сістэме вобразаў;

– найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў.

***умець*:**

– выяўляць агульнае і адрознае ў літаратуры пазначанага перыяду і прыгожым пісьменстве папярэдніх эпох;

– спалучаць тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных мастацкіх з’яў;

– упісаць літаратурны твор у сацыякультурны кантэкст эпохі;

– вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу;

– скласці тэсты па літаратурных творах, фактах жыццёвага і творчага шляху аўтара;

– каменціраваць тэксты твораў, характарызуючы іх з культуралагічнага, гісторыка-бытавога, літаратуразнаўчага і іншых аспектаў;

– працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай.

***валодаць:***

– адпаведным паняційным і літаратуразнаўчым апаратам;

– сучаснай метадалогіяй і методыкай літаратуразнаўчых даследаванняў;

– навыкамі разнастайных спосабаў аналізу мастацкіх твораў.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступнай кампетэнцыі:

БПК 13. Характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай літаратуры ў аспекце родавай і відавай прыналежнасці мастацкіх твораў, асаблівасцей іх паэтычнай і стылістычнай арганізацыі.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 108 гадзін, з іх 60 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 30 гадзін, практычныя заняткі – 30 гадзін.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая форма атэстацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме экзамена ў IV семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Агульная характарыстыка беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў

***Тэма 1.1. Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры на мяжы XIX – XX стагоддзяў***

Ажыўленне грамадска-палітычнага і літаратурнага жыцця напрыканцы 1880-х гг. Публіцыстыка. Навуковая дзейнасць Я. Карскага, Е. Раманава, А. Багдановіча, М. Доўнар-Запольскага, інш. Рускамоўныя перыядычныя выданні на тэрыторыі Беларусі. Выхад да чытача кніг на беларускай мове. Праблема польска-руска-беларускага полілінгвізму ў тагачаснай літаратуры.

Працяг традыцый XIX стагоддзя і нараджэнне новых у пачатку XX стагоддзя. Рэвалюцыя 1905–1907 гадоў і нацыянальнае адраджэнне. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва», кансалідацыя творчых сіл на платформе «нашаніўства». З’яўленне іншых перыядычных выданняў. Разгортванне кнігавыдавецкай, культурна-асветніцкай дзейнасці. Славянскі друк пачатку XX стагоддзя пра беларускае нацыянальнае адраджэнне, літаратуру, дзейнасць «Нашай нівы». Ацэнкі газеты ў савецкі час.

***Тэма 1.2. Пафас, стылёвыя плыні, вядучыя матывы, вобразы, жанры беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў***

Засваенне вопыту фальклору. Паскоранасць літаратурнага працэсу. Адраджэнскі пафас. Праблема метаду і стылю. Рэалізм, рамантычныя формы спасціжэння свету. Праявы мадэрнізму ў творчасці Я. Купалы, В. Ластоўскага, З. Бядулі і інш. Трансфармацыя еўрапейскіх традыцый на беларускай глебе.

Станаўленне нацыянальнай жанравай сістэмы. Вядучая роля паэзіі, зараджэнне нацыянальнага ліра-эпасу, станаўленне прозы і драматургіі. Узнікненне крытыкі і публіцыстыкі, разгортванне перакладчыцкай справы.

Унёсак у развіццё паэзіі, прозы, драматургіі, крытыкі і літаратуразнаўства Каруся Каганца, Альберта Паўловіча, Гальяша Леўчыка, Казіміра Сваяка, Зоські Верас, Алеся Гурло, Канстанцыі Буйло, Антона Навіны, Сяргея Палуяна і інш.

## Раздзел 2. Пісьменнікі-пачынальнікі навейшай літаратуры

***Тэма 2.1. Ядвігін Ш.***

Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі, 1869–1922). Факты біяграфіі. Пачатак літаратурнай творчасці. Зборнікі апавяданняў «Бярозка», «Васількі». Уплыў фальклору на фарміраванне таленту. Этычная пазіцыя пісьменніка. Гуманістычная скіраванасць сацыяльна-псіхалагічных апавяданняў («З бальнічнага жыцця», «Гаротная», «Зарабляюць» і інш.). Паказ трагічнага лёсу людзей працы. Алегарычныя творы («Падласенькі», «Рабы», «Павук», інш.). Філасафічнасць зместу імпрэсій і вершаў у прозе («Васількі», «Раны», «Чалавек»). Раман «Золата» як адзін з першых твораў буйной празаічнай формы

ў нацыянальнай літаратуры. Ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці. Публіцыстыка Ядвігіна Ш. Творы мемуарнага жанру.

***Тэма 2.2. Цётка*** (Алаіза Пашкевіч, 1876–1916). Біяграфічныя звесткі. Ідэйна-эстэтычныя вытокі творчасці. Цётка як пачынальніца беларускай палітычнай лірыкі («Мора», «Хрэст на свабоду», «Добрыя весці», інш.). Паэзія Цёткі і творчы вопыт М. Горкага, Л. Украінкі, І. Франко. Элегічная і медытатыўная лірыка перыяду эміграцыі («На чужой старонцы», «З чужыны», «Мае думкі» і інш.). Цётка-празаік. Выкарыстанне сімволікі і алегорыі, асаблівасці псіхалагізму ў творах. Публіцыстыка («Да вясковай моладзі беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Як нам вучыцца», інш.). Унёсак у развіццё мемуарнага жанру («Успаміны з паездкі ў Фінляндыю», «З дарогі»). Педагагічная дзейнасць А. Пашкевіч. Вобраз пісьменніцы ў літаратуры і мастацтве.

***Тэма 2.3. Уладзіслаў Галубок*** (Уладзіслаў Голуб, 1882–1937). Жыццёвы лёс, шматграннасць творчай асобы. Пачатак літаратурнай працы. Адлюстраванне мінулага і сучаснасці ў п’есах «Ганка», «Пан Сурынта», «Суд», «Пісаравы імяніны», «Плытагоны» і інш. Зварот да розных жанравых формаў. Майстэрства стварэння камедыйных сітуацый. Шырокая прысутнасць фальклору ў п’есах. Унёсак у станаўленне беларускага тэатра і драматургіі. «Вандроўны» тэатр У. Галубка ў гісторыі беларускай культуры.

***Тэма 2.4. Вацлаў Ластоўскі*** (1883–1938). Біяграфічныя звесткі. Унёсак В. Ластоўскага ў гістарычную навуку, мовазнаўства, этнаграфію. Ідэйна-творчыя ўстаноўкі пісьменніка і дыскусія 1913 года ў «Нашай ніве». Клопат пра высокі мастацкі ўзровень нацыянальнай літаратуры (артыкул «Па сваім шляху»). Жанравая разнастайнасць твораў В. Ластоўскага, іх праблемна-тэматычнае наватарства. Адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі падзей беларускай гісторыі («Князёўна Рагнеда», «Сож і Няпро», «Каменная труна», «Лабірынты», «О, Крыўская зямля...», інш.). Адраджэнскія матывы ў творах «Прывід», «Лебядзіная песня». Інтэлектуалізм, філасафічнасць прозы і паэзіі пісьменніка («Дзень ружавай кветкі», «Мары», «Нарадзіны», «Слёзы», «У час аблогі», інш.).

***Тэма 2.5. Змітрок Бядуля*** (Самуіл Плаўнік, 1886–1941). Жыццёвыя «ўніверсітэты» будучага пісьменніка. Ранняя творчасць (вершы, лірычныя мініяцюры і імпрэсіі «Плач пралескаў», «Над сажалкай», «Кветка», «Прытуліся ка мне»). Адметныя рысы Бядулі-апавядальніка. Тэма мастака і мастацтва ў творчасці (апавяданні «Велікодныя яйкі», «Бондар», вершы «На горне душы першы верш я каваў...», «Мары паэта», аповесць «Салавей»). Лірыка перыяду Першай сусветнай вайны («Сухавеі», «...І сотнямі тысяч...», «Ад крыві чырвонай...», інш.). Гісторыя напісання рамана «Язэп Крушынскі». Ідэйны змест твора. Навізна праблематыкі і вобраза галоўнага героя. Беларускі фальклор у творчасці З. Бядулі. Казачная ўмоўнасць і яе роля ў

сюжэтна-кампазіцыйным афармленні аповесці «Сярэбраная табакерка». Працяг З. Бядулем традыцый сацыяльна-філасофскай прозы. З. Бядуля – публіцыст, літаратурны і тэатральны крытык, дзіцячы пісьменнік.

***Тэма 2.6. Алесь Гарун*** (Аляксандр Прушынскі, 1887–1920). Жыццёвы і творчы лёс. Думы аб Беларусі – лейтматыў паэзіі А. Гаруна. Вобраз выгнанніка-рэвалюцыянера і вобраз Радзімы ў творах зборніка «Матчын дар». Гісторыя напісання і выдання кнігі. Тэматычныя аспекты лірыкі паэта («Мая люба», «Дзяўчаці», «У прыпар», «Як ліст вярбінкі маладой...», «Ідуць гады», «Адбітак», інш.). Творчае засваенне і выкарыстанне набыткаў фальклору. Проза А. Гаруна (І. Жывіцы): жанравая шматстайнасць, праблемна-тэматычнае наватарства. «Жывыя казкі», іх мастацкія асаблівасці. А. Гарун – публіцыст.

***Тэма 2.7. Цішка Гартны*** (Зміцер Жылуновіч, 1887–1937). Грамадска-палітычная дзейнасць. Трагедыя лёсу. Тэматычнае наватарства паэзіі. Вобраз рабочага ў зборніку «Песні». Адлюстраванне драматызму чалавечага жыцця ў канкрэтных сацыяльных абставінах (апавяданне «Велікодная каробка»). Змена танальнасці, вобразна-мастацкіх сродкаў у кнігах савецкага часу («Песні працы і змагання», «Урачыстасць»). Драматызм выбару паміж асабістым і грамадскім, спроба стварэння вобраза актыўнага героя ў апавяданнях зборнікаў «Трэскі на хвалях» (1923), «Прысады» (1927), «Гаспадар» (1930). Сучаснае прачытанне твораў. Праца над раманам «Сокі цаліны». Вобраз прафесійнага рэвалюцыянера Рыгора Нязвычнага. Жанрава-тэматычнае наватарства, сюжэт і кампазіцыя твора, асаблівасці стылю. «Сокі цаліны» ў ацэнцы крытыкі 1920-х гадоў. Сучаснае прачытанне рамана. Ц. Гартны – крытык і нарысіст. Вобраз З. Жылуновіча ў беларускай літаратуры.

## Раздзел 3. Творчасць пісьменнікаў-класікаў

***Тэма 3.1. Янка Купала*** (Іван Луцэвіч, 1882–1942). Біяграфічныя звесткі. Фарміраванне творчай асобы. Роля Я. Купалы ў развіцці беларускай паэзіі і драматургіі. Вытокі творчасці. Пераемнасць традыцый папярэднікаў і іх узбагачэнне. Творчая эвалюцыя паэта ў зборніках «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця». Тэмы, матывы, вобразы, мастацкія асаблівасці лірыкі. Спецыфіка купалаўскага рамантызму. Раннія паэмы («Зімою», «Нікому», «Адплата кахання»). Наватарская сутнасць драматычных паэм «Адвечная песня», «Сон на кургане», іх гісторыка-літаратурнае значэнне. Сувязь твораў з асноўнымі матывамі лірыкі. Рамантычныя паэмы Я. Купалы: характары герояў, прырода канфлікту, мастацка-вобразная сістэма твораў. Праблемы духоўнага абуджэння народа ў паэмах «На Куццю», «На Дзяды». Арыгінальнасць зместу і формы паэмы «Яна і я». Гістарычная абумоўленасць звароту пісьменніка да драматычных жанраў. Майстэрства Купалы-драматурга. Сцэнічны лёс камедыі «Паўлінка», прататыпы герояў. Рэалістычна-бытавы і ўмоўна-рамантычны планы дзеяння, вобразы-сімвалы ў драме «Раскіданае гняздо». П’еса Я. Купалы

ў кантэксце беларускай літаратуры аб «раскіданых гнёздах». Час і месца дзеяння ў п’есе «Тутэйшыя». Сістэма вобразаў. Акцэнтаванне ўвагі на трагедыі «тутэйшасці».

Роздум аб гістарычным лёсе Беларусі ў паэзіі і публіцыстыцы 1918–1919-гг. («Для Бацькаўшчыны», «Свайму народу», «Спадчына», «Паязджане», «Больш самачыннасці», інш.). Зборнікі «Спадчына» і «Безназоўнае». 1930-я гады ў лёсе і творчасці Я. Купалы. «Ляўкоўскі» цыкл вершаў. Паэтычная канцэпцыя жыцця ў творах. Ацэнкі цыкла ў савецкія дзесяцігоддзі і на сучасным этапе. Паэма «Тарасова доля». Зборнікі паэзіі «Песня будаўніцтву», «Беларусі ардэнаноснай», «Ад сэрца». Лірыка і публіцыстыка Я. Купалы перыяду Вялікай Айчыннай вайны («Беларускім партызанам», «Паўстаў народ», «Зноў будзем шчасце мець і волю», «Кліч да беларускага народа» і інш.). Гістарызм мыслення аўтара. Я. Купала – перакладчык. Вобраз народнага паэта ў літаратуры і мастацтве.

***Тэма 3.2. Якуб Колас*** (Канстанцін Міцкевіч, 1882–1956). Біяграфічныя звесткі. Традыцыі рускай літаратуры ў фарміраванні будучага мастака слова. Лірыка Я. Коласа. Агульнае і адрознае з Я. Купалам. Зборнік паэзіі «Песні-жальбы»: дамінантныя вобразы, матывы, танальнасць кнігі. Мастацкае спасціжэнне паэтам рэалій рэвалюцыйнай эпохі («Да працы!», «Покліч»). Роздум аб лёсе народа і Радзімы («Беларускаму люду», «На чужыне», «Крыж», «Цені-страхі», «Звон шыбаў»). Паэма «Новая зямля» як этапная з’ява ў творчасці Я. Коласа і ўсёй беларускай літаратуры. Праблема зямлі і волі. Жанравая прырода паэмы. «Новая зямля» ў крытыцы і літаратуразнаўстве. Твор Я. Коласа і сучаснасць. Паэма «Сымон-музыка». Аўтарскія рэдакцыі. Канцэпцыя мастака і мастацтва. Адметнасць кампазіцыі. Роля лірычных адступленняў і ўстаўных навел. Вобразна-выяўленчае майстэрства аўтара ў паэме «Рыбакова хата».

Проза пісьменніка. Праблематыка, жанрава-стылёвыя асаблівасці апавяданняў. Эвалюцыя і адметнасць коласаўскага псіхалагізму («Васіль Чурыла», «Нёманаў дар», «Малады дубок», інш.). Філасофскія навелы-прытчы (зборнік «Казкі жыцця»). Фальклорныя і літаратурныя вытокі твораў, арыгінальнасць жанравай формы, філасофска-сацыяльны змест («Жывая вада», «Хмарка», «Стары лес», «Балотны агонь», «Курган» і інш.). Апавяданні Я. Коласа 1920-х гадоў («Сяргей Карага», «Крывавы вір», «Туды, на Нёман!», «Балаховец»). Палемічная скіраванасць твораў супраць тагачасных літаратурных канонаў. Спачуванне ахвярам рэвалюцыі. Трылогія «На ростанях». Гісторыя напісання. Аўтабіяграфізм. Уплыў агульнай атмасферы часу на заключную частку твора. Лабановіч як прадстаўнік перадавой беларускай інтэлігенцыі, пошук ім шляхоў да народа. Высокая культура псіхааналізу, філасофскія адступленні ў трылогіі. Паказ калектывізацыі ў аповесці «Адшчапенец». Твор Я. Коласа і паэма «Краіна Муравія»

А. Твардоўскага. Дакументальная аснова, праблематыка аповесці «Дрыгва». Творчасць Я. Коласа ў гады Вялікай Айчыннай вайны: публіцыстыка, лірыка, паэмы «Суд у лесе», «Адплата». Грамадская дзейнасць народнага паэта. Пісьмо-запавет Я. Коласа нашчадкам. Мастацкая і навукова-крытычная літаратура пра пісьменніка.

***Тэма 3.3. Максім Багдановіч*** (1891–1917). Жыццяпіс. Нетрадыцыйнасць постаці М. Багдановіча ў нацыянальнай літаратуры. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Дыскусія 1913 года і пазіцыя пісьменніка. Праблема красы ў творах «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару», «У вёсцы», «Свяча бліскучая зіяе...», «Санет (На цёмнай гладзі сонных луж балота…)». Творчая гісторыя кнігі «Вянок», першае і наступныя яе выданні. Ідэйна-мастацкае адзінства, лірычныя сюжэты цыклаў і ўсёй кнігі. Паэтычнае майстэрства аўтара.

Пейзажная і інтымная лірыка. М. Багдановіч як пачынальнік філасофскай плыні ў беларускай паэзіі («Жывеш не вечна, чалавек...», «С. Е. Палуяну», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...», інш.). Узмацненне грамадзянскага і патрыятычнага пафасу на заключным этапе творчасці («Беларусь, твой народ дачакаецца...», «Ты не згаснеш, ясная зараначка...», «Пагоня»). Узбагачэнне нацыянальнай паэзіі класічнымі жанрамі, новымі рытмічнымі і страфічнымі формамі. Жанравая і тэматычная навізна прозы пісьменніка. Ідэя «нацыянальнага стылю» ў артыкуле «Забыты шлях». Праца па асэнсаванні гісторыі беларускай літаратуры. М. Багдановіч і культурна-гістарычная школа. Літаратурна-крытычная праца і публіцыстыка пісьменніка. М. Багдановіч як заснавальнік нацыянальнай школы мастацкага перакладу. Вобраз Максіма Кніжніка ў літаратуры, музыцы, выяўленчым мастацтве.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ МЯЖЫ XIX -- XX СТАГОДДЗЯЎ»

**дзённая форма атрымання адукацыі**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, пытанні па тэме | Колькасць аўдытор-ных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| **1.** | **АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ МЯЖЫ XIX – XX СТАГОДДЗЯЎ** | **4** | **2** | **6** | | | |
| **1.1.** | **Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры на мяжы XIX – XX стагоддзяў** | **2** | | **2** | | | |
| | 1. Ажыўленне грамадска-палітычнага і літаратурнага жыцця напрыканцы 1880-х гг.<br>2. Рускамоўныя перыядычныя выданні на тэрыторыі Беларусі. Выхад да чытача кніг на беларускай мове.<br>3. Праблема польска-руска-беларускага полілінгвізму ў тагачаснай літаратуры.<br>4. Працяг традыцый мінулага стагоддзя і нараджэнне новых.<br>5. Рэвалюцыя 1905–1907 гадоў і нацыянальнае адраджэнне.<br>4. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва», кансалідацыя творчых сіл на платформе «нашаніўства». З’яўленне іншых перыядычных выданняў.<br>5. Разгортванне кнігавыдавецкай і культурна-асветніцкай дзейнасці. | 2 | | 2 | Мушынскі, М.І нічога, апроч праўды : Якой быць «Гісторыі беларускай літаратуры». – Мінск, 1990.<br>Факсімільнае выданне газет «Наша доля», «Наша ніва».<br>Камп’ютарная прэзентацыя. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[1]<br>[3]<br>[4]<br>[7] | Вуснае апытанне.<br>Тэсціраван-не ў СДН MOODLE<br>https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2969 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.2.** | **Пафас, стылёвыя плыні, вядучыя матывы, вобразы беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзя** | **2** | **2** | **4** | | | |
| **1.2.1.** | 1. Засваенне вопыту фальклору. Паскоранасць літаратурнага працэсу. Адраджэнскі пафас.<br>2. Праблема метаду і стылю. Рэалізм, рамантычныя формы спасціжэння свету. Праявы мадэрнізму ў творчасці Я. Купалы, В. Ластоўскага, З. Бядулі і інш. Трансфармацыя еўрапейскіх традыцый на беларускай глебе.<br>3. Станаўленне нацыянальнай жанравай сістэмы. Развіццё лірычнай паэзіі, зараджэнне нацыянальнага ліра-эпасу, станаўленне прозы і драматургіі.<br>4. Узнікненне крытыкі і публіцыстыкі, разгортванне перакладчыцкай справы. | 2 | | 4 | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br><br>Дад.:<br>[1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[7]<br>[8] | Вуснае апытанне. |
| **1.2.2.** | Унёсак у развіццё паэзіі, прозы, драматургіі, крытыкі і літаратуразнаўства:<br>1. Каруся Каганца,<br>2. Альберта Паўловіча,<br>3. Гальяша Леўчыка,<br>4. Казіміра Сваяка,<br>5. Зоські Верас,<br>6. Алеся Гурло,<br>7. Канстанцыі Буйло,<br>8. Антона Навіны,<br>9. Сяргея Палуяна і інш. | | 2 | | Мультымедыя. Тэксты твораў пісьменікаў. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[2]<br>[3]<br>[5]<br>[7] | Абарона рэфератаў, прэзента-цый. |
| **2.** | **ПІСЬМЕННІКІ-ПАЧЫНАЛЬНІКІ НАВЕЙШАЙ ЛІТАРАТУРЫ** | **14** | **16** | **24** | | | |
| **2.1.** | **Ядвігін Ш.** | **2** | **2** | **2** | | | |
| **2.1.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Ядвігіна Ш. | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Факты біяграфіі. Пачатак літаратурнай творчасці.<br>2. Зборнікі апавяданняў «Бярозка», «Васількі». Уплыў фальклору на фарміраванне таленту. Этычная пазіцыя пісьменніка.<br>3. Раман «Золата» як адзін з першых твораў буйной празаічнай | | | | М. Гарэцкі «Гісторыя беларускае літаратуры».<br>Партрэт пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[3] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | формы ў нацыянальнай літаратуры.<br>4. Публіцыстыка Ядвігіна Ш. Творы мемуарнага жанру. | | | | | [6]<br>[7] | |
| **2.1.2.** | Ядвігін Ш. – адзін з пачынальнікаў беларускай прозы | | 2 | | | | |
| | 1. Асаблівасці ранніх апавяданняў Ядвігіна Ш. («Заморскі звер», «З маленькім білецікам» і інш.). Вобразы людзей з народа.<br>2. Гуманістычная скіраванасць сацыяльна-псіхалагічных апавяданняў («З бальнічнага жыцця», «Гаротная», «Зарабляюць» і інш.).<br>3. Алегарычныя творы («Падласенькі», «Рабы», «Павук», інш.). Філасафічнасць зместу імпрэсій і вершаў у прозе («Васількі», «Раны», «Чалавек»).<br>4. «Золата»: спроба рамана. Ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці. | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[6]<br>[7] | Інтывідуальная гутарка.<br>Тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2969 |
| **2.2.** | **Цётка** | **2** | **4** | **4** | | | |
| **2.2.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Цёткі | 2 | 2 | 4 | | | |
| | 1. Біяграфічныя звесткі.<br>2. Цётка як пачынальніца беларускай палітычнай лірыкі («Мора», «Хрэст на свабоду», «Добрыя весці», інш.). Элегічная і медытатыўная лірыка перыяду эміграцыі («На чужой старонцы», «З чужыны», «Мае думкі» і інш.).<br>3. Цётка-празаік. Выкарыстанне сімволікі і алегорыі, асаблівасці псіхалагізму ў творах.<br>4. Публіцыстыка («Да вясковай моладзі беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Як нам вучыцца», інш.).<br>5. Унёсак у развіццё мемуарнага жанру («Успаміны з паездкі ў Фінляндыю», «З дарогі»).<br>6. Педагагічная дзейнасць А. Пашкевіч. Вобраз пісьменніцы ў літаратуры і мастацтве. | | | | Творы літаратуры і мастацтва, прысвечаныя Цётцы. Партрэт пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[7] | |
| **2.2.2.** | Наватарства паэзіі і прозы Цёткі | | 2 | | | | |
| | 1. Тэматычны абсяг, матывы лірыкі Цёткі.<br>2. Асаблівасці вобразнай сістэмы і мастацкага стылю. Пераемнасць літаратурных традыцый XIX ст. і наватарскія | | | | Тэксты твораў пісьменніцы. | Асн.:<br>[1]<br>[2] | Вуснае апытанне.<br>Тэсціраван- |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | тэндэнцыі.<br>3. Праблемна-тэматычнае, жанравае наватарства прозы Цёткі («Прысяга над крывавымі разорамі», «Навагодні ліст», «Зваротлівы», «Міхаська», «Лісты з дарогі» і інш.).<br>4. Майстэрства псіхалагічнага аналізу, метафарычнасць стылю Цёткі-празаіка («Асеннія лісты», «Зялёнка», «Лішняя»). | | | | | Дад.:<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[7] | не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2969 |
| **2.3.** | **Уладзіслаў Галубок** | **2** | **2** | **4** | | | |
| **2.3.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Уладзіслава Галубка | 2 | | 4 | | | |
| | 1. Жыццёвы лёс, шматграннасць творчай асобы.<br>2. Пачатак літаратурнай працы.<br>3. Адлюстраванне мінулага і сучаснасці ў п’есах «Ганка», «Пан Сурынта», «Суд», «Пісаравы імяніны» і інш.<br>4. Унёсак у станаўленне беларускага тэатра і драматургіі. «Вандроўны» тэатр У. Галубка. | | | | Камп’ютарная прэзентацыя. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[2]<br>[3] | |
| **2.3.2.** | Жанравая разнастайнасць драматургіі Уладзіслава Галубка | | 2 | | | | |
| | 1. Майстэрства стварэння камедыйных сітуацый («Суд», «Пісаравы імяніны»). Фальклор у п’есах. Прыёмы і сродкі індывідуалізацыі характараў.<br>2. Народная драма «Ганка». Прыкметы меладрамы ў творы.<br>3. Асноўныя калізіі фальклорна-гістарычных драм «Пан Сурынта», «Плытагоны». | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[2]<br>[3] | Ідывідуальная гутарка. Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 |
| **2.4.** | **Вацлаў Ластоўскі** | **2** | **2** | **4** | | | |
| **2.4.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Вацлава Ластоўскага | 2 | | 4 | | | |
| | 1. Біяграфічныя звесткі.<br>2. Ідэйна-творчыя ўстаноўкі пісьменніка і дыскусія 1913 года ў «Нашай ніве». Клопат пра высокі мастацкі ўзровень нацыянальнай літаратуры (артыкул «Па сваім шляху»).<br>3. Жанравая разнастайнасць твораў В. Ластоўскага, іх праблемна-тэматычнае наватарства.<br>4. Інтэлектуалізм, філасафічнасць прозы і паэзіі пісьменніка («Мары», «Нарадзіны», «Слёзы», «У час аблогі», інш.).<br>5. Аповесць «Лабірынты». | | | | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br><br>Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. Т.8, Мінск, 2019.<br>Партрэт пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[1]<br>[3]<br>[6]<br>[7] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.4.2.** | Проза Вацлава Ластоўскага | | 2 | | | | |
| | 1. Ідэйна-творчыя ўстаноўкі В. Ластоўскага (артыкул «Сплачвайце доўг») і апавяданне «Дзень ружавай кветкі».<br>2. Адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі падзей беларускай гісторыі («Сож і Няпро», «Каменная труна», «Князёўна Рагнеда», «Лабірынты», інш.).<br>3. Адраджэнскія матывы ў творах «Прывід», «Лебядзіная песня». | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.: [1] [2] Дад.: [1] [3] [6] [7] | Вуснае апытанне. Тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2969 |
| **2.5.** | **Змітрок Бядуля** | **2** | **2** | **4** | | | |
| **2.5.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Змітрака Бядулі | 2 | | 4 | | | |
| | 1. Жыццёвыя «ўніверсітэты» будучага пісьменніка.<br>2. Ранняя творчасць. Адметныя рысы Бядулі-апавядальніка.<br>3. Лірыка перыяду Першай сусветнай вайны («Сухавеі», «...І сотнямі тысяч...», «Ад крыві чырвонай...», інш.).<br>4. Раман «Язэп Крушынскі». Гісторыя напісання.<br>5. Беларускі фальклор у творчасці З. Бядулі. Аповесць «Сярэбраная табакерка».<br>6. Працяг З. Бядулем традыцый сацыяльна-філасофскай прозы.<br>7. З. Бядуля – публіцыст, літаратурны і тэатральны крытык, дзіцячы пісьменнік. | | | | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. Партрэт пісьменніка. Творы-прысвячэнні пісьменніку. | Асн.: [1] [2] Дад.: [3] [6] [7] | |
| **2.5.2.** | Змітрок Бядуля – майстар прозы | | 2 | | | | |
| | 1. Філасофска-алегарычныя творы (лірычныя імпрэсіі і мініяцюры «Плач пралескаў», «Над сажалкай», «Кветка», «Прытуліся ка мне» і інш.). Іх рамантычны характар і матывы.<br>2. Тэма мастака і мастацтва ў творчасці З. Бядулі (апавяданні «Велікодныя яйкі», «Бондар», вершы «На горне душы першы верш я каваў…», «Мары паэта», аповесць «Салавей»).<br>3. Раман «Язэп Крушынскі». Ідэйны змест. Навізна праблематыкі і вобраза галоўнага героя. Мастацкая сутнасць твора. | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.: [1] [2] Дад.: [3] [5] [7] | Вуснае апытанне. Абарона даклада. Тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php? |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | id=2969 |
| **2.6.** | **Алесь Гарун** | **2** | **2** | **2** | | | |
| **2.6.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Алеся Гаруна | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Перыяды жыцця і творчасці.<br>2. Думы аб Беларусі – лейтматыў паэзіі А.Гаруна.<br>3. Вобраз выгнанніка-рэвалюцыянера і вобраз Радзімы ў творах зборніка «Матчын дар».<br>4. Тэматычныя аспекты лірыкі паэта («Мая люба», «Дзяўчаці», «У прыпар», «Як ліст вярбінкі маладой...», «Ідуць гады», «Адбітак», інш.).<br>5. Проза А. Гаруна (І. Жывіцы): жанравая шматстайнасць, праблемна-тэматычнае наватарства.<br>6. «Жывыя казкі», іх мастацкія асаблівасці.<br>7. А. Гарун – публіцыст. | | | | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>Факсімільнае выданне кнігі «Матчын дар».<br>Партрэт пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5]<br>[7] | |
| **2.6.2.** | Паэзія і проза Алеся Гаруна | | 2 | | | | |
| | 1. Вобраз Радзімы, адраджэнскія матывы ў зборніку «Матчын дар» («Чаму з маленства, з ураджэнства...», «Мае думкі», «Муляру», інш.).<br>2. Філасофская лірыка А. Гаруна: ідэі, матывы, вобразы («Жыццё», «Як ліст вярбінкі маладой...», «Ідуць гады», інш.).<br>3. Тэматычная і жанравая разнастайнасць прозы Алеся Гаруна («Першы снег», «Маладое», «Свята», «П'ера і Каламбіна» і інш.). | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5]<br>[7] | Індывідуальнае апытанне.<br>Праверка чытацкіх дзённікаў.<br>Тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2969 |
| **2.7.** | **Цішка Гартны** | **2** | **2** | **4** | | | |
| **2.7.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Цішкі Гартнага | 2 | | 4 | | | |
| | 1. Грамадска-палітычная дзейнасць.<br>2. Тэматычнае наватарства паэзіі. Вобраз рабочага ў зборніку «Песні». Змена танальнасці, вобразна-мастацкіх сродкаў у | | | | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – | Асн.:<br>[1]<br>[2] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | кнігах савецкага часу («Песні працы і змагання», «Урачыстасць»).<br>3. Тэматыка і праблематыка апавяданняў (зб. «Трэскі на хвалях», «Прысады», «Гаспадар»).<br>4. Раман «Сокі цаліны». Раман у ацэнцы крытыкі 1920-х гадоў. Сучаснае прачытанне рамана.<br>5. Ц. Гартны – крытык і нарысіст. | | | | Мінск, 1999–2015.<br>Партрэт пісьменніка. | Дад.:<br>[3]<br>[8] | |
| **2.7.2.** | Проза Цішкі Гартнага: пошукі творчага самавыяўлення | | 2 | | | | |
| | 1. Праблематыка, характары герояў, матывацыя іх учынкаў у апавяданнях «Велікодная каробка», «Бегунец», «Чырвонаармеец Панкел Ліпа», «Больш за ўсіх», «Трэскі на хвалях», «Прысады», «Свае блінцы».<br>2. Значэнне рамана «Сокі цаліны» ў беларускай раманістыцы. Наватарства задумы. Вобраз прафесійнага рэвалюцыянера. Аўтарскія адносіны да галоўнага героя і сучаснае ўспрыманне Рыгора Нязвычнага. Мастацка-стылёвыя асаблівасці рамана. | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[8] | Вуснае апытанне.<br><br>Рэйтынгавая кантрольная работа № 2. |
| **3.** | **ТВОРЧАСЦЬ ПІСЬМЕННІКАЎ-КЛАСІКАЎ** | **12** | **12** | **18** | | | |
| **3.1.** | **Янка Купала** | **4** | **4** | **6** | | | |
| **3.1.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Янкі Купалы | 4 | | 6 | | | |
| | 1. Біяграфічныя звесткі. Фарміраванне творчай асобы.<br>2. Роля Я. Купалы ў развіцці беларускай паэзіі і драматургіі. Вытокі творчасці.<br>3. Спецыфіка купалаўскага рамантызму. Раннія паэмы («Зімою», «Нікому», «Адплата кахання»).<br>4. Наватарская сутнасць драматычных паэм.<br>5. Рамантычныя паэмы Я. Купалы.<br>6. Майстэрства Купалы-драматурга.<br>7. Роздум аб гістарычным лёсе Беларусі ў паэзіі і публіцыстыцы 1918–1919-гг. («Для Бацькаўшчыны», «Свайму народу», «Спадчына», «Паязджане», «Больш самачыннасці», інш.).<br>8. Зборнікі «Спадчына» і «Безназоўнае». 1930-я гады ў лёсе і творчасці Я. Купалы. | | | | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>Энцыклапедыя «Янка Купала» (2018).<br>Факсімільныя выданні кніг Янкі Купалы. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5]<br>[7]<br>[8] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 9. Лірыка і публіцыстыка Я. Купалы перыяду Вялікай Айчыннай вайны.<br>10. Я. Купала – перакладчык.<br>11. Вобраз народнага паэта ў літаратуры і мастацтве. | | | | | | |
| **3.1.2.** | Мастацкі свет паэзіі Янкі Купалы. Драматычныя паэмы | | 2 | | | | |
| | 1. Творчая эвалюцыя паэта ў зборніках «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця». Тэмы, матывы, вобразы, мастацкія асаблівасці лірыкі.<br>2. Прырода канфлікту ў рамантычных паэмах «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва». Праблемы духоўнага абуджэння народа ў паэмах «На Куццю», «На Дзяды».<br>3. Наватарская сутнасць драматычных паэм «Адвечная песня», «Сон на кургане». | | | | Тэксты твораў пісьменніка.<br>Афіша рок-оперы «Адвечная песня». | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br><br>Дад.:<br>[1]<br>[3]<br>[7]<br>[8] | Вуснае апытанне. |
| **3.1.3.** | Драматургія Янкі Купалы | | 2 | | | | |
| | 1. Ідэя, тэма, сімвалічна-вобразны змест камедыі «Паўлінка». Сцэнічны лёс твора. «Паўлінка» як трагікамедыя.<br>2. Рэалістычна-бытавы і ўмоўна-рамантычны планы дзеяння, вобразы-сімвалы ў драме «Раскіданае гняздо».<br>3. Час і месца дзеяння ў п’есе «Тутэйшыя». Сістэма вобразаў. Акцэнтаванне ўвагі на трагедыі «тутэйшасці». | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[1]<br>[2]<br>[3]<br>[7]<br>[8] | Індывідуальная гутарка. |
| **3.2.** | **Якуб Колас** | **4** | **4** | **6** | | | |
| **3.2.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа | 4 | | 6 | | | |
| | 1. Біяграфічныя звесткі.<br>2. Лірыка Я. Коласа. Агульнае і адрознае з Я. Купалам.<br>3. Паэма «Новая зямля» як этапная з’ява ў творчасці Я. Коласа і ўсёй беларускай літаратуры. «Новая зямля» ў крытыцы і літаратуразнаўстве. Твор Я. Коласа і сучаснасць.<br>4. Паэма «Сымон-музыка». Аўтарскія рэдакцыі.<br>5. Паэма «Рыбакова хата». | | | | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>Факсімільнае выданне кнігі «Песні-жальбы». | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[4]<br>[7] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 6. Проза пісьменніка. Праблематыка, жанрава-стылёвыя асаблівасці апавяданняў.<br>7. Філасофскія навелы-прытчы (зборнік «Казкі жыцця»).<br>8. Трылогія «На ростанях». Гісторыя напісання. Аўтабіяграфізм.<br>9. Паказ калектывізацыі ў аповесці «Адшчапенец». Твор Я. Коласа і паэма «Краіна Муравія» А. Твардоўскага.<br>10. Дакументальная аснова, праблематыка аповесці «Дрыгва».<br>11. Творчасць Я. Коласа ў гады Вялікай Айчыннай вайны: публіцыстыка, лірыка, паэмы «Суд у лесе», «Адплата».<br>12. Мастацкая і навукова-крытычная літаратура пра пісьменніка. | | | | | [8] | |
| **3.2.2.** | Лірыка і паэтычны эпас Якуба Коласа | | 2 | | | | |
| | 1. Зборнік паэзіі «Песні-жальбы»: дамінантныя вобразы, матывы, танальнасць кнігі.<br>2. Паэма «Новая зямля». Праблема зямлі і волі. Жанравая прырода паэмы.<br>3. Паэма «Сымон-музыка». Канцэпцыя мастака і мастацтва. Адметнасць кампазіцыі. Роля лірычных адступленняў і ўстаўных навел. | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[4]<br>[7]<br>[8] | Індывідуальная гутарка, франтальнае апытанне. |
| **3.2.3.** | Мастацкі свет прозы Якуба Коласа | | 2 | | | | |
| | 1. Праблематыка, жанрава-стылёвыя асаблівасці апавяданняў. Эвалюцыя і адметнасць псіхалагізму («Васіль Чурыла», «Нёманаў дар», «Малады дубок», інш.).<br>2. Зборнік «Казкі жыцця». Фальклорныя і літаратурныя вытокі твораў, арыгінальнасць жанравай формы, філасофска-сацыяльны змест («Жывая вада», «Хмарка», «Стары лес», «Балотны агонь», «Курган» і інш.).<br>3. Апавяданні Я. Коласа 1920-х гадоў («Сяргей Карага», «Крывавы вір», «Туды, на Нёман!», «Балаховец»).<br>4. Трылогія «На ростанях». Лабановіч як прадстаўнік перадавой інтэлігенцыі. Псіхааналіз, філасофскія адступленні ў | | | | Тэксты твораў пісьменніка. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[4]<br>[7]<br>[8] | Індывідуальная гутарка. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | творы. | | | | | | |
| **3.3.** | **Максім Багдановіч** | **4** | **4** | **6** | | | |
| **3.3.1.** | Жыццёвы і творчы шлях Максіма Багдановіча | 4 | | 6 | | | |
